ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 23 (405) Аўторак, 22 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдзень у аўторак, чацьвер, суботу. | Год выд. VI | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2 - 3 гадз. дню. Тэл. № 90 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, [illegible] Менск, Комсам. 2

Дзевяць год як Чырвоная армія і Чырвоны флет сьцерагуць краіну Саветаў

Нашы баявыя задачы.

Сьвяткаваньне дзявятай гадавіны Чырвонай арміі мае вялікае выключнае значэньне. Ваенныя небясьпекі, якія ў гэтым годзе усё ясьней вырысоўваюцца у міжнародных абставінах, патрабуюць павароту ўвагі усіх рабочых і сялян, да пытаньняў абароны Саюзу.

Сучасная вайна ў значнай ступені сьцірае грань паміж фронтам і тылам. Ваенныя опэрацыі могуць пры тых ці іншых умовах пераносіцца на некалькі сот вёрст за лінію фронту.

Рабочыя і сяляне павінны быць заўсёды падрыхтаваны да таго, каб даць адказ лютаму ворагу. Яшчэ часьцей ад іх патрабуецца, захаваць у сябе і астатнюю частку мірнага насельніцтва ад ядавітых газаў, якія будуць пераносіцца самалётамі ворага на вялікую адлегласьць. Ад кожнага дарослага рабочага і селяніна патрабуецца здольнасьць уладаць зброяй, знаць ваенную справу, каб быць падрыхтаваным у патрэбны момант уліцца ў шэрагі Чырвонай арміі.

Асабліва гэта становіцца выключна важным для нашай рэспублікі, якая мяжуе з капіталістычным сьветам.

Трэба прэста сказаць, штэ да сучаснага моманту шырокія пласты рабочых і сялян, захопленыя справаю гаспадарчага будаўніцтва, удзялялі мала ўвагі справе абароны краіны. Дэмобілізаваныя чырвонаармейцы і камандзіры адарваліся ад Чырвонай арміі і не рабілі спробы падтрымаць і абнаўляць свае вайсковыя веды. Пераменны склад тэр-частак і даапрызыўнікі ў пэрыод паміж зборамі мала ўдзялялі ўвагі сваёй вайсковай падрыхтоўцы і палітычнаму разьвіцьцю. Слаба разьвіта сетка вайсковых куткоў і стралковых тыраў. Недастатковы размах працы па фізкультуры. Амаль не пранікаюць у масы рабочых і сялян вайсковая кніга і газэта. Ячэйкі Т. С. А. у вёсцы (ды і на фабрыцы) сустракаліся толькі ў рэдкія выпадках. Далёка недастаткова была разгорнута праца Авіяхіму. У справе ваенізацыі краіны мы можам зрабіць многае. Хоць і вялікая наша матар'яльная беднасьць, мы усё-ж у справе пабудовы стралковых тыраў, організацыі вайсковых куткоў, распаўсюджваньня ведаў па вайсковай і хэмічнай абароне, можам шагнуць далёка наперад. За апошнія гады высока паднялася актыўнасьць рабочых і сялян, шырока разгарнулася тэрытарыяльнае будаўніцтва; у краіне маюцца вялізарныя масы запасных камандзіраў і чырвонаармейцаў, якія ваявалі ў грамадзянскую вайну і прайшлі шэрагі Чырвонай арміі, усё гэта дазваляе хутка пасунуць наперад справу ваенізацыі насельніцтва.

У дзявятую гадавіну Чырвоная армія, праглядае сваю гатоўнасьць да абароны будаўніцтва краіны саветаў. Разам з ёю рабочыя і сяляне дэмонстрыруюць сваю моцную волю да павышэньня абароназдольнасьці краіны.

Дзявятая гадавіна зьявіцца пераможным момантам у настроі шырокіх рабоча-сялянскіх мас.

Толькі пры гэтых умовах мы у момант нападу будзем падрыхтаваны, зьяднаўшыся навокал УсеКП(б) дамо належны адпор клясаваму ворагу—капіталістычнаму сьвету.

Няхай жыве мір пад моцнай абаронай Чырвонай арміі, няхай узмацняецца наша гаспадарка, наша культура, няхай справа абароны і баяздольнасьці глыбока пусьціць карэньні ў масы рабоча-сялянскай моладзі Савецкай Беларусі.

9 год Чырвонай арміі

Артыкул члена Рэволюцыйнага Вайсковага Савету СССР тав. Будзённага



У вагні рэволюцыйнай барацьбы нарадзілася магутная ўзброеная сіла працоўных першай Савецкай краіны.

Пасьпешна скованыя чырвоныя баявыя часьці вытрымалі непамернае напружаньне сіл і сродкаў, і прынесьлі вялічайшыя ахвяры ва імя заваяваньня і замацаваньня Кастрычнікавай рэволюцыі. Працоўныя масы нашай краіны далі, бяспрыкладныя ўзоры ўзброенай барацьбы прыгнечаных і падняволеных супроць сваіх эксплёататараў-капіталістых і памешчыкаў.

Армія значна ўзмацнела

Цяпер усе цяжары вайны засталіся ззаду. Бурнае адраджэньне гаспадаркі нашай краіны і рост вытворчых сіл, далі магчымасьць Чырвонай арміі падысьці да сваіх непасрэдных задач—узмацненьня абароназдольнасьці нашага Саюзу. Чырвоная армія, у шмат разоў колькасна паменшаная, рэорганізованая і стала афармаваная, цяпер пасьпешна абучаецца вайсковай справе і політычна выхоўваецца, штогодна папаўняе свае баявыя рады.

Мы імкнемся да захаваньня міру

Рабоча-Сялянская ўлада ня раз заявіла і заяўляе ўсім імпэрыялістычным дзяржавам, што нападаць мы не зьбіраемся. Малалікавая Чырвоная армія зьяўляецца неадмоўным паказальнікам мірнай палітыкі СССР. Гэта добра ведаюць і нашы ворагі. Але ім патрэбна якая небудзь зачэпка, каб над захаваньнем выдуманага «чырвонага імпэрыялізму» абмануць свае рабочыя масы і напасьці на нас.

У сучасны момант міжнародныя абставіны абвастраюцца. Ангельскія консэрватары фактычныя штурхачы ўзброенай інтэрвенцыі супроць нас, ствараюць у суседніх з намі буржуазных дзяржавах фашысцкія перавароты, ствараюць на нашых заходніх межах фашысцкі кардон.

Асабліва ў апошнія часы ангельскі буржуазны друк вядзе шалёную кампанію супроць СССР.

Імкненьне і сымпатыя рабочых мас імпэрыялістычных дзяржаў да СССР, забастоўка ангельскіх гарнякоў, Кітайская народна-вызваленчаская вайна, паўстаньне рабоў і прыгнечаных у колёніях,—усё гэта прыпісваецца справе нашых рук. Хоць усе сымпатыі рабочых мас імпэрыялістычных дзяржаў і на нашым баку, усё-ж такі адносіцца бясьпечна да абароны нашай рабоча-сялянскай краіны было-б вялікай памылкай. Капіталістыя рана ці позна, ня гледзячы на свае ўнутраныя супярэчнасьці,

якія ніколі ня спыняюцца

дамовяцца для ўзброенага нападу на нас. Мы павінны кожны дзень, кожны час гэта памятаць і быць гатовымі да ўсякіх нападаў. Чым лепш мы будзем падрыхтованы, тым лягчэй мы справімся з нашымі ворагамі.

Нашы задачы ў справе абароназдольнасьці нашага Саюзу

Перш за ўсе неабходна цьвёрда памятаць і ведаць, што сучасная вайна будзе весьціся не аднэй арміяй, а ўсёй краінай у цэлым. Армія мірнага часу зьяўляецца толькі тым неабходным кадрам, які ў выпадках нападаў зможа толькі даць неабходнае кіраўніцтва ўзброеным працоўным масам. Стварэньне шматмільённай арміі—справа саміх працоўных і ў першую чаргу рабочай клясы, як авангарду.

Удзельнічаючы актыўна ў грамадзкіх організацыях ТСА Авіахім, праходзячы даапрызыўную падрыхтоўку, вывучаючы вайсковую справу ў вучэбных установах і рабфаках, рабочы, селянін і служачы ўдзельнічаюць у будаўніцтве масавай арміі.

У сучасны момант мы павінны дасягнуць таго, каб кожны грамадзянін, рабочы, селянін і служачы быў падрыхтованы і адчуваў сябе байцом многамільённай арміі працоўных.

С. Будзённы.

Правінцыя Чжэцьзян у руках кантонцаў.

Палова палітычных зьняволеных у Польшчы—моладзь.

Клюб юных таварышоў у Аўстраліі.

Ня так даўно комуністычная партыя Аўстраліі пачала організоўваць пад сваім кіраўніцтвам пролетарскіх дзяцей. Комуністычная партыя зьвярнулася з адозваю да ўсіх дзяцей, у якой паведамляе аб організацыі «клюбу юных таварышоў» (піонэраў) і заклікае дзяцей уступіць у яго.

Махінацыі румынскае ахранкі.

Суд над тав. Ракоўскім з мэтаю адцягнуць грамадзкую ўвагу ад процэсу Стэфанава.

Напярэдадні пачатку процэсу Барыса Стэфанава з Бухарэсту нечакана надышло паведамленьне, што ў вайсковым судзе 4 дывізіі ў Ясах у бліжэйшыя дні распачнецца разгляд справы па абвінавачваньні сучаснага паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Францыі т. Ракоўскага, Дабраджыяну і Бушора, якія абвінавачаны ў змове у 1918 годзе супроць румынскага караля і стварэньні організацыі з мэтаю агалашэньня пролетарскае дыктатуры ў Румыніі.

Як думаюць, інсцэнаваньне процэсу тав. Ракоўскага робіцца з мэтаю адцягнуць увагу грамадзкае думкі ад процэсу Стэфанава.

З мінулага

Пятро Глебка

Чырвонай Арміі да яе дню дзевятай гадавіны прысьвячаю.



Мернымі крокамі вуліцу мераюць,
Радасьць у песьні зьвініць...
Песьня ліецца, поўніцца вераю
Ў новыя, сьветлыя дні.

Шэраг за шэрагам, шэраг і шэраг
вось яны—нашы байцы!
У шлемах высокіх, шынэліках шэрых...
Хочацца з імі у ногу ісьці.

Значыць таму успаміны зьвіліся,
Значыць таму і на воку сьляза:
Пра слаўны паход, што адбыўся калісьці,
Старэйшы мне брат расказаў.

Узьняўся народ, каб сказаць сваё слова...
Юдзеніч, Дзянікін, Калчак—
Уся гэта чорная збродня і сволач,
На нас кіравалі свой шаг.

Хадзілі далёка, хадзілі ў паходы:
Варшава, Каўказ і Сібір.
За Волю і Шчасьце і Радасьць народу
Жыцьцё сваё слалі на жвір.

Галодныя, босыя, чорныя
Ішлі праз палі, праз лясы, сенажаць:
—Хай лепей сырая зямля нас прыгорне,
Чымсь Волю працоўных аддаць.

. ногі асьмяглі, і рукі павісьлі—
Ня зломны, сталёвы іх дух не асьмяг:
Ад Чорнага мора да бурнае Віслы
Прайшлі яны слаўна свой шлях.

Ну, хто мог змагацца з такою вось сілай
Чырвоная Армія—сіле імя.
Прасторы сьпявалі, лясы галасілі,
Бо кроўю ірдзела, ірдзела зямля.

У гэтай крыві фарбавалі мы сьцягі,
Каб Волю на сьцягах Чырвоных узьвеяць.

Хай ведае Лёндан і Вена і Прага,
Што армія наша змагацца умее.

Хай помняць і ведаюць бойку ліхую,
Хай знаюць паны і цяпер—
Чырвоная армія добра вартуе
Волю свайго СэСэСэР!

Тав. Кашэн ня упушчан у Румынію.

Процэс Стэфанава адкладзен.—Ахранка арыштавала 75 удзельнікаў рабочае дэмонстрацыі ў чэсьць прыезду Кашэна

Кашэн, якога румынская прыгранічная ўлада не прапусьціла на тэрыторыю Румыніі і затрымала на паліцэйскай варце, прыехаў у Вену.

Генэрал-інспэктар румынскае ахранкі паведаміў, што процэс Стэфанава адкладзены.

У Бухарэсьце арыштавана 75 ўдзельнікаў рабочае дэмонстрацыі, якая зьявілася на вакзал, чакаючы Кашэна.

«Універсул» выступае з пагромнымі артыкуламі, у якіх папераджае, што Кашэну ня ўдасца прыехаць у Румынію.

Прыгавар над комсамольцамі ў Кішынёве.

У Кішынёве (Бесарабія) слухалася справа па абвінавачваньню шасьці юнакоў у «злачынстве супроць дзяржаўнай небясьпекі», якое выявілася ў тым, што яны чыталі і захоўвалі ў сябе комуністычную літаратуру.

4 абвінавачаныя прыгавораны да турэмнага зьняволеньня на розныя тэрміны, ад 15-ці дзён да 4-х год; адзін абвінавачаны апраўданы; адна з абвінавачаных, якая не зьявілася на суд, была завочна прыгаворана да 5-ці гадоў турмы.

Выступленьні румынскіх фашыстаў.

У Румыніі ізноў адбываюцца пагромныя выступленьні.

У Кішынёве група фашыстых-студэнтаў продэмонстравала па галоўных вуліцах з антысэміцкімі выгукамі і разграміла шмат вітрын у крамах, кафэ і рэсторанах.

Фашыстыя цяжка зьбілі і паранілі шмат прысутных у рэстаранах.

Кантонскае войска заняло Ханчжоу.

Згодна паведамленьняў з Шанхаю, войска Сун-Чуан-Фана адступіла ад Ханьчжоу ў непарадку і з рабункамі. Німбо (канечны шлях чыгункі, якая вядзе ад Ханчжоу на ўсход) заняты нацыянальнымі войскамі без перашкоды.

Трывога сярод «цьвёрдакаменных» у зьвязку з падыходам кантонцаў да Шанхаю.

На пасяджэньні габінэту абгаварвалася толькі пытаньні аб Кітаі. У колах «цьвёрдакаменных» асаблівае абурэньне выклікалі апошнія паведамленьні аб набліжэньні нацыянальных войск да Шанхаю.

Патугі Англіі застацца на рэчцы Янцзы

Новыя ўмовы Англіі ў перамовах з Кантонам.

Шанхайскі корэспондэнт — «Нью-Ерк Геральд Трыбюн» паведамляе, што ангельскія прадстаўнікі, якія праводзяць перамовы ў Ханькоу, высунулі такі проэкт згоды: Англія адмаўляецца ад усіх концэсій ва ўнутраным Кітаі пры ўмове захаваньня сучаснага становішча ў раёне ніжняе плыні рэчкі Янцзы з цэнтрам у Шанхаі.

«Такім парадкам,—зазначае карэспондэнт,—прапанова прадбачыць прызнаньне ўлады нацыяналістых ва ўнутраных правінцыях з тым, каб Шанхай быў захаваны ў якасьці базы для заходняга ўплыву».

Моладзь у польскіх турмах.

Польскі комуністычны саюз моладзі падпаў зноў пад новыя перасьледваньні з боку ўраду. Атрыманыя нядаўна весткі аб ліку моладзі, якая знаходзіцца ў асобных турмах Польшчы, даюць наступны малюнак: у турмах гораду Лодзі з агульнай лічбы зьняволеных 46,6 проц. складае моладзь у ўзросьце ад 18 да 21 году. Палова політычных зьняволеных падае на долю моладзі.

СІРОЦІНСКАЕ КОНКРЭТНАЕ КІРАЎНІЦТВА

Беларуская вёска і мястэчка мае шмат вольных рук. Аб гэтым гаварыў тав. Адамовіч у справаздачы ўраду БССР на трэцяй сесіі Ўсесаюзнага ЦВК.

Такое становішча асабліва хвора адбіваецца на моладзі. Комсамол стараецца шляхам большага ахопу маладняка саматужнай прамысловасьцю і іншымі жыцьцёвымі мерапрыемствамі палепшыць матар'яльнае становішча бядняцкай і батрацкай моладзі, якая ў сваёй пераважнасьці і папаўняе армію вясковых беспрацоўных.

Важнасьць гэтых патуг Ленінскага Комсамолу відаць «крыху зразумеў» і Сіроцінскі раён, Віцебскай акругі.

Для больш плённай працы па зьнішчэньню беспрацоўя ў вёсцы і мястэчку, ён (Сіроцінскі Райкамол) наладзіў цесную сувязь з райкомам профсаюзу работнікаў зямлі і лесу і за чырвона-сінімі подпісямі пруць сумесны цыркуляр:

— «Усім працкомам і ўпаўнаважаным па рабоце сярод батрацтва. Дарагія таварышы! Зная ўсе труднасьці стаячыя перад нашымі комсамольскімі работнікамі і сябрамі саюзу, у дзень правядзеньня пастаноўкі вучнёўства рабочай моладзі можна апрадзяліць і заранее сказаць, што напрасна і нікчаму напраўляць нашы... (аднаго слова нельга прачытаць. З. Г.) групы па вярбоўцы гэтых матар'ялаў, калі да гэтай справы ня будзе прыцягнута ўвага рабочай моладзі...»

Непаверыў сабе ў незразумеласьці напісанага, я прачытаў яшчэ пару раз пачатак цыркуляру, пасьля чаго пераканаўся, што ў ім нічога не гаворыцца. Чытаем далей.

— Гэтым (вучнёўствам) трэба зацікавіць усю працоўную моладзь, ібо пусьць яна ведае, калі яна ня мае ў сабе ніякай кваліфікацыі, то ёй вельмі цяжка пры ад'езьдзе з вёскі ў горад, как гэта мае месца цягі нашай моладзі, папасьці на працу, і ў тую-ж першую чаргу нападаюць пад сакрашчэньне».

Ну, тут хоць сказана,—набірайцеся кваліфікацыі вясковай прамысловасьці і гайда ў горад. Таксама, справа!

Нагаварыўшы аб тым, што «тарыфная стаўка можа павышацца тады, калі рабочая моладзь знае і будзе старацца ў падняцьці свайго знаньня і сваёй кваліфікацыі», зьвярнуўшы ўвагу працкомам і ўпаўнаважаных на «справідловае дзела, работаючага ў таго альбо другога кустара», Сіроцінскі райкамол і райком саюзу працаўнікоў зямлі і лесу даходзяць да эпогея свайго «канкрэтнага кіраўніцтва» нізавымі работнікамі:

— «Сіроцінскі райком ЛКСМБ і райком саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых прызываюць усю рабочую моладзь к гэтай бальшой рабоце. Работаць не аслабляясь (Узбагачэньне беларускай мовы народнымі словамі! З. Г) сумесна з комсамольскімі організацыямі і перападгатовіць (бачыце, яны ўжо раз падрыхтавалі!) стальную зьмену, кваліфіцыраваную зьмену для нашых старых работнікаў!

Адказны сакратар Сіроцінскага райкому ЛКСМБ: **Жураўлёў**.

Старшыня райкому Саюзу: **Заблоцкі**.

Эконом. праў. работнік: **(подпіс)**».

Упаўнаважаны Спаскай комсамольскай ячэйкі па працы сярод батрацтва, атрымаўшы ліст з раёну, прыняўся на складох разьбірацць напісанае ў ім

Чытаў, бядняга, чытаў, а разумець нічога ня мог. Апанавала хлапца злосьць, якая вылілася рэзолюцыяй на атрыманы ліст:

— **«Гэту дзірэкціву не разумеюць і яе пісцы, а паслана ўсім».**

Што нам застаецца яшчэ дабавіць?— Апошнія словы далі найлепшую ацэнку **«канкрэтнаму кіраўніцтву»** Сіроцінскіх работнікаў.

Зьм. Гарошын.

На справаздачных сходах Гарсаветаў.

Справаздачная кампанія выкрывае цэлы шэраг недахопаў працы Гарсаветаў.

Высьвятленьне гэтых недахопаў на старонках друку дапаможа нам выжыць іх.

Больш такіх комсамольцаў.

(Ст, Менск, Заходняя чыгунка).

На агульным сходзе сяброў саюзу рабіў справаздачу малады чыгуначнік аб працы гарсавету.

Ён добра высьвятліў усё тое, што было прароблена за справаздачны пэрыод і што ў будучым неабходна зрабіць. Пасьля гэтага адбыліся вялікія спрэчкі.

У спрэчках рабочыя імкнуліся падкрэсьліць усе хворыя бакі і даць дзелавую крытыку ў працы.

Некаторыя таварышы ўказвалі на тое, што вельмі дрэнныя кватэрныя ўмовы, што гарсавету трэба будзе ў далейшым зьвярнуць асаблівую ўвагу на задавальненьне рабочых кватэрамі.

Гаварылі і аб беспрацоўі, аб бяспрытульнасьці. Гарсавету, трэба накіраваць усю сілу на зьнішчэньне гэтых зьявішчаў.

Шмат казалі і аб тым, што дэпутаты абраныя ў гарсавет ня робяць справаздачы перад сваймі выбаршчыкамі. А гэта ненармальна. Кожны выбаршчык хоча ведаць, што робіць дэпутат, абраны ім у гарсавет.

Указвалі і на тое, што на некаторых вуліцах няма тратуараў, а калі і ёсьць, дык вельмі дрэнныя. Амбуляторыі ня могуць ахапіць сабою хворых рабочых, у чыгуначным раёне няма карэты хуткай дапамогі. І яшчэ на цэлы шэраг недахопаў указвалася выступаючымі.

Дакладчык у заключным слове пераконваў і запэўніваў, што ў пэрыод перавыбарнай кампаніі неабходна падкрэсьліць усе недахопы і ў будучым уноўабраным дэлегатам павесьці рашучую барацьбу за зьнішчэньне гэтых недахопаў.

Аб комсамольцу, які рабіў справаздачу, дарослыя рабочыя адклікаліся вельмі добра. Адзін чыгуначнік кажа: больш такіх комсамольцаў у гарсавет, яны добра будуць працаваць і выконваць тое, што ад іх патрабуюць выбаршчыкі!

Мікола Крук.

Сынагогі пад кватэры рабочым.

(Менск).

На прадвыбарны сход саматужнай моладзі зьявілася каля 140 чалавек. Дэпутат **Кліпцан** зрабіў справаздачу аб дзейнасьці гарсавету і аб яго асабовым удзеле ў гэтай працы. Пасьля дакладу пасыпаліся пытаньні:

Што з спэцклясамі, якія будуць. Чаму электрычныя ўводы такія дарагія. Што ён сам зрабіў у гарсавеце і г. д.

У спрэчках выступілі 7 таварышоў. У асаблівасьці хвалілі гарсавет за тое, што ён зьвярнуў належную ўвагу на акраіны гораду. Крылі за тое, што позна пачалі каналізацыю, дрэннае становішча з кватэрамі. Асаблівую ўвагу ўдзялілі прапановам, у якіх гаварылася аб тым, што трэба большую ўвагу зьвярнуць на забясьпечаньне мэдыцынскай дапамогай дзяцей саматужнікаў старэйшых 18 гадоў; узмацненьне барацьбы з простытуцыяй і хуліганствам, барацьбы з бюрократызмам ва ўстановах гарсавету.

Некаторыя гаварылі нават аб тым каб тыя сінагогі, якія ўжо пустуюць бо мала іх наведваюць адняць і прыстасаваць да кватэр для рабочых. Усё роўна яны не атапліваюцца, а ад гэтага псуецца будынак. Цікава, што гэту прапанову высоўвала тая частка моладзі, якая ў мінулым годзе яшчэ сама наведвала іх.

У заключэньне была прынята рэзолюцыя, у якой адзначылі ўсё тое, што было выяўлена ў спрэчках.

І. Д.



З працай на „абы як" далёка не заедзеш

Саматужнік аб вучнях

(Менск)

Як ня дзіўна—а за моладзь трымала прамову «старая саматужная гвардзія».

Дакладчыкі і садакладчыкі—чакалі. Моладзь--дзяўчаты і хлапцы таксама чакалі хутка пачнуць спэктакль.

Чакалі і старыкі, седзячы ў халоднай залі ў шапках і паліто падціснуўшы губы.

Моладзь ня мела чаго сказаць—хоць і было што.

Нарэшце пасьля некалькіх прамоў, на эстраду выскачыў ў кепачцы барадаты чалавек.

І казаў ён толькі аб моладзі--бо інтарэсы ў гэты момант як раз былі агульныя і вучняў і ў саміх майстроў-саматужнікаў.

-- Бяда бывае часта з вучнямі. У нас саматужнікаў нават з-за самай нікчэмнай дробязі шмат супярэчнасьцяй з вучнямі. І мы ня ведаем, як выйсьці з гэтага становішча. Як зрабіць. Па мойму ў далейшым праз нашых дэпутатаў і гарсавет--трэба было-б стварыць спэцыяльную конфліктную комісію па разборы гэтых спраў. І мы ня будзем больш мець гэтай бяды.

Можна зламаць галаву

(Г. Петрыкаў, Мазыршчына).

Перад перавыбарамі гарсавету прэзыдыум яго рабіў справаздачы аб сваей працы. За год працы гарсавет зрабіў многа. Па яго пастанове падстроілі дарогі і вуліцы Петрыкава, дзе вельмі многа было гразі і балота. Культсэкцыяй гарсавету адчынены два пункты па ліквідацыі няпісьменасьці. Разам з гэтым адзначалі, што культсэкцыя слаба кіравала працай клюбаў, нардомаў.

Коопэратыўная сэкцыя навербавала 785 пайшчыкаў у спажывецкую коопэрацыю і 203 ў сельска-гаспадарчую.

Цяпер у горадзе будуецца лесапільны завод і млын, праведзена электрэфікацыя.

Дрэнна тое, што ў гарсавеце ёсьць малы актыў—усяго 10 чалавек. У далейшым гэты недахоп трэба будзе зьнішчыць. Таксама недахопам у працы гарсавету зьяўляецца тое, што ён позна пачаў клапаціцца аб дастаўцы для гораду апалу. Трэба, каб гарсавет паклапаціўся аб наладжваньні тротуараў, бо па іх хадзіць нельга. Можна галаву зламаць.

Усе гэтыя недахопы гарсавету трэба будзе зьнішчыць.

Юнкор С. З.

Ну і сорам!

(Г. Слуцк).

У кампаніі па перавыбарам гарсавету нашы комсамольцы і наогул рабочая моладзь прымала вельмі слабы ўдзел. Былі такія выпадкі, што комсамольцы не зьяўляліся на справаздачныя сходы, як у чыгуначнікаў ці нарсувязі, куды зьявіліся тры хлапцы. З такім становішчам далёка не заедзеш.

Такая кампанія, як перавыбары гарсавету, можна сказаць, у пачатку зусім не зачапіла моладзі. Ня ведаю, як будзе ў далейшым. Былі такія выпадкі, як, напрыклад, сход саматужнікаў, на які не зьявіўся ніводны малады хлапец ці дзяўчына, ня гледзячы на тое, што сярод саматужнікаў ёсьць значная частка моладзі.

Трэба, каб наведваньне перавыбарных сходаў комсамольцамі было забясьпечана на ўсе сто процантаў,

А. Б.

Як ты жывеш?

Пачнем з асабістага прыкладу

Наша задача—падрыхтаваць культурнае пакаленьне

Пакажы прыклад другім!

Калі мы ўважліва прыгледзімся да жыцьця паасобнага комсамольца, асабліва актывістага, дык заўважым вялікую пядбайнасьць, няўменьне правільна скарыстоўваць працоўны дзень. Няма часу для таго, каб добра памыцца, пачысьціць вопратку.

А комсамольцы і асабліва актыў павінны вось імення тут і паказаць добры прыклад, сваімі культурнымі паводзінамі навучыць карыснаму другіх.

У нас часта робяць даклады аб новым быце такія дакладчыкі, ад якіх, калі глянеш на яго знадворны выгляд—нудзіць пачынае:. расьцягнуты, брудны, паўгода ў бані ня быў.

Даклад яго, які заклікае да новага быту, не закранае слухача, а дакладчык гатоў яшчэ з месца і адказ атрымаць: **Усё гэта словы і словы--а сам як выглядзішш?**

Адсюль просты вывад--неахайнасьці і бруднасьці трэба абвясьціць самую рашучую барацьбу. Посьпех не будзе залежыць толькі ад асабістага прыкладу перадавой моладзі, аб'яднанай ў комсамол.

Трэба перш за ўсё пачаць з сябе і памятаць, што ты **зьяўляешся прыкладам для другіх**, для чаго неабходна:

Найбольш чуласьці к таварышам, асабліва да дзяўчат.

Сачыць за чыстатою свайго цела і вопраткі.

Сачыць за чыстатою ў хаце.

Не смаркацца ў руку і не выціраць рукавом нос.

Рашуча адмовіцца ад абвінавачваньня ў мяшчанстве тых таварышоў, **хто змагаецца з бруднасьцю, хто трымае сябе ў прыемным выглядзе.**

Сход, на якім ня сьпяць

(Выпіска з протоколу)



... Камарынскую...



Лявоніху...

Комсамольцаў не пакоіць каханьне.

(Веляшкоўская яч. ЛКСМБ, Лёзьнянскі раён, Віцебшчына).

Нашы комсамольцы яшчэ не зразумелі новы быт так, як яго трэба праводзіць у жыцьцё. Асабліва гэта заўважваецца, калі прыгледзімся да каханьня. Яно зьяўляецца самым балючым месцам у быце нашай моладзі.

З-за каханьня часта адбываюцца папойкі, пасыўнасьць, апаты да грамадзкай працы, незадавальненьне жыцьцём і інш., а некаторыя комсамольцы гатовы з прычыны каханьня выйці нават з шэрагаў саюзу.

Ня раз на агульным сходзе ячэйкі стаяла пытаньне аб быце моладзі, па якому выступалі таварышы і выносілі прапановы аб зьнішчэньні хворых момантаў, але конкрэтнага нічога не ўхвалілі.

Зараз некаторыя комсамольцы, нават і актывістыя кажуць, што калі хлопец слабахарактарны, дык яму трэба стараніцца дзяўчат, бо «яны яго зьвядуць з панталыгі».

Такая думка зусім памылковая. Мы старанісца дзяўчат не павінны, а наадварот, павінны чым найхутчэй іх уцягнуць у грамадзкую працу.

Янка Шаірка.

Комсамольцы—з хуліганамі.

(Валявачы, Сьмілавіцкі раён, Менскае акругі).

Калі ідзеш вечарам па вуліцы нашай вёскі—дык уважліва агледайся ва ўсе бакі і ідзі самай сярэдзінай, бо так і пальне хто небудзь з-за вугла, што і сваіх не пазнаеш.

Хто-ж займаецца такімі штукамі?

Моладзь, сярод якой і **комсамольцы адыгрываюць не малую ролю.**

Валявачоўская комсамольская ячэйка зусім ня дбае аб сваёй працы. Карыстаецца пашанай толькі сярод хуліганаў. Дзяўчаты комсамольцаў баяцца, бо яны над імі пасьміхаюцца і сьпяваюць розныя брыдкія песьні і прыпеўкі.

Мурог.

Адцягваем ад царквы.

(М-ка Смалявічы, Менскай акругі)

Раней у Смалявічах ня было харавога гуртку, але цяпер ужо яго організавалі і займаецца ў ім каля 50 чалавек моладзі.

Стары быт зьнішчаецца. Хор-гурток нясе новую вясёлую песьню ў вёску.

Дзяўчаты, якія ходзяць ў царкву сьпяваць у хуткім часе будуць прыцягнуты к гэтаму гуртку, бо ў ім весялей і цікавей.

Юрка.

Па культурнаму.


(Вёска Бадзяны, Грэскі р., Слуцкая акруга).

Раней, калі ня было комсамольскай ячэйкі, хлопцы ішлі на вячэркі, каб **ушчыкнуць дзяўчыну і пазьдзеквацца з яе.**

Цяпер ня тое. Хлопцы ня йдуць па вячэркі, каб строіць кпіны з дзяўчат, а праводзяць там **культурна - масавую працу.**

Кожны вечар, асабліва ў сьвяточныя дні, моладзь на вячорках **сьпявае розныя вясёлыя песьні і гуляе ў гульні.**

Яд.



ІІ-гі Усебеларускі Краязнаўчы Зьезд.

(Вынікі працы).

— Асноўнай адзінкай пры вывучэньні павінен быць раён.—Вельмі важным і неабходным зьезд прызнаў уцягненьне ў справу краязнаўства моладзі.—Мясцовая ўлада—на дапамогу краязнаўчаму руху.—Больш увагі нацменшасьцям у краязнаўчым руху! Студэнцтва і профэсура прымаюць малы ўдзел у краязнаўстве.

Адбыўся Другі Усебеларускі Краязнаўчы Зьезд. Пастановы яго маюць вялікае значэньне для далейшага разьвіцьця краязнаўчага руху па БССР.

Зьезд канчаткова замацаваў організацыйныя формы краязнаўчай сеткі і намеціў пэрспэктывы далейшай працы па краязнаўству.

Такімі формамі зьезд прызнаў: краязнаўчы гурток у сельсавеце, раённае і акруговае таварыства і школьныя краязнаўчыя гурткі. Зьезд таксама прызнаў правільнай думку, праведзеную ў статутах гэтых організацый аб поўнай падпарадкаванасьці гуртkoў у сельсаветах раённым таварыствам і аб падлегласьці раённых т-ваў акруговым у справе дасьледваньня і вывучэньня акругі.

Усе памяненыя краязнаўчыя організацыі маюць об'ектам вывучэньне пэўнай тэрыторыі, з мэтай дапамагчы гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву. Асноўнай адзінкай пры вывучэньні ўзят раён. Праца па ўсебаковаму вывучэньню і дасьледваньню раёнаў прызнана важнай, асабліва ў галіне экономікі і гаспадаркі. Гэтая праца павінна праводзіцца ў самым сьцісылым контакце з мясцовымі органамі ўлады.

Каб мець магчымасьць лепш выкапаць гэтую задачу, зьезд даў дырэктыву прасунуць краязнаўчую сетку да нізавых адміністрацыйных адзінак—сельсаветаў з тым, каб распачаць сталае і дакладнае вывучэньне гэтых адзінак, як частак раёнаў і ўцягнуць у краязнаўства актыў сялянства. Практыка паказала, што і малапісьменныя сяляне пры зацікаўленасьці бываюць вельмі карысны ў справе краязнаўства. Вельмі важным і неабходным зьезд прызнаў уцягненьне ў справу краязнаўства моладзі, якая павінна стаць піонэрам гэтай справы. Спосабамі пашырэньня краязнаўчай справы павінны быць популярызацыя гэтага пытаньня на сходах працоўных мас і практычныя вынікі працы. Бо трэба прызнаць, што пытаньне краязнаўства, ня гледзячы на яго шпаркі рост, вельмі мала популярызавана сярод шырокіх мас працоўных. Вынікам усёй працы па вывучэньню краю павінна быць дапамога мясцовым організацыям у справе гаспадарча-культурнага будаўніцтва і наладжаньне мясцовага музэю, які павінен стаць адбіткам усяго акаляючага жыцьця.

Мясцовыя органы ўлады ў гэтай справе павінны пайсьці на сустрэчу краязнаўчым організацыям шляхам адводу памяшканьняў пад музэй і дапамогі матар'яльнай.

Зьезд адзначыў слабае разгортваньне краязнаўчай справы сярод нацыянальных меншасьцяй і даў дырэктыву краязнаўчым організацыям зьвярнуць большую ўвагу на гэтае пытаньне. Дзеля намечаньня пляну працы і вырашэньня іншых пытаньняў па краязнаўчаму руху сярод яўрэйскай нацыянальнасьці на зьезьдзе працавала яўрэйская сэкцыя. Галоўным пытаньнем разгледжаным сэкцыяй, было пытаньне аб вывучэньні сучаснага мястэчка і ўцягваньні ў гэту справу шырокіх яўрэйскіх працоўных мас.

Зьезд зьвярнуў належную ўвагу на наладжаньне краязнаўчай справы сярод студэнцтва. Пытаньне гэта вельмі важнае і балючае. Вышэйшыя Навучальныя Установы павінны стаць кузьнямі па падрыхтоўцы будучых краяведаў. А між тым да апошняга часу гэта ня мела месца: выкладаньне дысцыплін не заўсёды грунтавалася на мясцовым матар'яле; студэнты і профэсура вельмі слаба былі ўцягнуты ў краязнаўчую справу; накіраваньня краязнаўчай справы сярод організацый студэнцкіх ня было. Зьезд адзначыў такое становішча як вялікі недахоп і пастанавіў прыняць належныя крокі да зьнішчэньня яго шляхам пастаноўкі пытаньня перад органамі НКА аб увядзеньні катэдры краязнаўства і ўцягненьня ў краязнаўчую справу профэсуры і большага ліку студэнцтва.

Накірунак часопісу «НАШ КРАЙ» зьезд прызнаў напрамак яго правільным і адпаведным запатрабаваньням месц і даў дырэктыву выпушчаць яго рэгулярна і не зьмяншаць памеру.

Адносна краязнаўчай справы ў далучаных да БССР Гомельскай і Рэчыцкай акругах зьезд прапанаваў ЦБК вывучыць гэта пытаньне і ўзяць курс на падраўніваньне краязнаўчай справы ў гэтых акругах да стану краязнаўчых організацый у БССР. На зьезьдзе працавала 187 дэлегатаў; з іх — з правам рашучага голасу 155 і з дарадчым - 32; ад раёнаў—82; ад акруговых краязнаўчых організацый—34, ад студэнтаў - 21 і ад цэнтральных устаноў 50.

Зьезд вызначыўся надзвычайнай актыўнасьцю і працаздольнасьцю. Гэта сьведчыць аб жыцьцёвасьці і неабходнасьці краязнаўчай справы.

А. КАЗАК.

Хто суніме п'яныя разгулы?

(Вёска Рагінь, Бабруйская акруга)

Цяпер у вёсцы Рагінь мужчыны і хлапцы часта наладжваюць «зімнія сьвяты», на якіх п'янствуюць і хуліганяць. Падгуляўшы—прыходзяць дамоў і распачынаюць бойкі

Напрыклад, Верабей **Базыль** прыбіў да сьмерці сваю жонку. Біў ён бутэлькай па галаве, аж бутэлька трэснула. І ўсё з-за таго, што яна ня пусьціла ў хату п'яных сяброў свайго мужа.

Прычына гэтаму—вялікая выганка самагонкі.

—«І хто суніме нашых гаспадароў, хто паломіць ім самагонныя машыны?»

Краснамір.

СТАРОНКА ЛІТАРАТУРЫ І КРЫТЫКІ.

Юр. Лявонны

На прадвесьні

Люты, люты...
Зімнія напевы...
Сіні бор
Хусьціначчку надзеў...
Нам гавораць
радыё напевы
Аб жудасьці
сенешніх падзей.
Блізка-блізка.
Зараз за кардонам,
Тонка сьвішчуць
Кулі ды бізун.
Так братоў мільёны
Цяжка стогнуць.
Краты ўціску
З мукамі грызуць.
І працуе ладна
дэфэнзыва —
Ў бела-панскіх катаў
ёсьць уздым..
Хіба гэта
дзеля Польшчы дзіва —
Разбурэньне
«хамскай» Грамады?...
Захрыпелі гады
перад сьмерцю...
Мо' рыхтуюць
Зноў які наскок?...
Толькі ім
здабытага не сьцерці,
І на нас
не налажыць акоў!...
Дык ад крыўды
сьлёз не варта траціць—
Захавае помсту
цёмны лес...
Там, на Захадзе,
«свабода і багацьце»,
там, на Захадзе,
«культура і прогрэс»!



КЛЯШТОРНЫ

Успамін

рнія цені апалі.
рэчкаю дрэмле сасна.
там,
бярозавых далях
кіт асыпае вясна
Я першую песьню калісьці
Складаў а такой-жа пары.
Шапталася соннае лісьце
У вячэрніх агарках зары.
жалі зыбучыя хвалі,
ся ў сінь туманоў.
ялярылі звонкія далі
п'яных струнах салаўёў...
...Мінаюць і дні, і нядзелі,
(Мінулага зноў ня сустрэць).
Агаркі зары дагарэлі,
А песьні ў душы не згарэць,..
першую песьню калісьці
кітнай вясьне падарыў...
ём залацістае лісьце
іло ў пераліваx зары
Вячэрнія цені апалі.
Над рэчкай драмала сасна.
А там,
У бярозавых далях
Блакіт асыпала вясна.

Алесь Розна.

Адзінота.

Слухаў бор высокі,
Што было навокал;
ыў ён, як вецер на абшар прылёг.
Разгарнуўшы крыльлі
Вецер з дзікай сілай
З новай, вольнай песьняй лётаў па палёх.

—

Там пад небам сінім,
Месяц над далінай
атымі пырскамі, зямлю абсыпаў
Ён тануў у мэры
Цалаваў прасторы
лькі ён ня слухаў, як той бор стагнаў.

—

Зоры срэбрам белым
Навакол глядзелі
Свой сьвет дарылі на ўвесь прастор
Песьняю глухою
Звонкамаладою
іваўся часам стары цёмны бор.

—

Залацісты месяц
Засьвяціў над лесам
атымі пырскамі землю ён абывіў,
Нават ён ня чуе,
Як той бор бушуе
д цёмным лесам ціха, ціха плыў.

Начлежнікі.

Над зямлёй, у поўнай красе, урачыста ўміраў дзень. Закат заірдзеўся рознымі колерамі, правёў па баку неба крывяныя палосы. Яшчэ змрок не абняў зямлі, як чарнявы вечар запаліў па нябожчыку—дню сьвечкі, каб шчыра ўшанаваць вялікі сонечны дзень...

Змрок закрыў рачным туманам вёску. Лёг на халаднаватую рэчку, якая гаварыла нешта, шаптала надбярэжнымі кустамі ціха так і любоўна.

Летнія ночы бываюць прыгожымі, бываюць сьветлымі!

Зямля прыемна пахне скошаным ды завяленым сенам. Пахне цёплай летняй смагай, што пакрысе ўбірае ў сябе туман.

Гараць агні ў хатах. Вуліца кідае, рассыпае пад гучны сьпеў гармонікі і цымбалаў няроўныя прыпевы і неразборчывыя галасы.

Ай-я-а-а-й-я-а...
Ох, з роднага бацькі, ой ды ў
родпае маці,
Я цьвіла, як журавінка-а-а...

За ракою калышыцца алешнік, ня дзьме вецер у поле; там цяпер чарната, цемень. На полі стаяць нязьвезеныя копы жыта, на аборках—сена.

За ракою гарыць, расплываецца па зямлі, цягнецца языкамі к небу, вогнішча начлежнікаў. Расплыліся цені начлежнікаў, поўзаюць па зямлі. Трашчыць у лесе і ў бярэзьніку сухое гальлё ад спужаных коняй.

Начлежнікі разьляглісл ў кустох абапал вогнішча. Адсьвет кідаецца ў вочы, сьвеціць на кусты... Самы старэйшы дзед Сапрон. Горача пры агні, а ён у аблезлай зімовай шапцы, у шубе з сярмягаю. Грэецца ля агню, паварачваецца сьпіною, засланяючы з аднаго боку вогнішча. Доўгая, згорбленая цень кладзецца поперак. Паціраючы чорныя рукі з крывымі пальцамі, гаворыць вясёла.

— Яно цяпер, скажу вам, цёпла на начлезе. Лепш, чым у сваёй хаце—ні камароў, ні машкары. А ў восень зямля халодная, сіверка, старому скора прастудзіцца...

Хочацца старому гаварыць што небудзь. Дзень ён працуе, словам перамовіцца не з кім, прасыхае горла. Можа ён гаварыць доўга: аб мінулым, аб жыцьці, і самыя нязначныя здарэньні афарбоўвае ў такі рознастойны колер, што яны становяцца для яго сапраўды вялікімі ды значнымі.

Хлапец Андрэй распрануўся, закінуў за куст ногі. На загарэлым і жорсткім твары ўсьмешка: ці то ад таго, што такая ноч, ці то ад маладой вясёласьці. Ляжыць на халаднаватай, абскубанай траве і сьпявае сам сабе пад нос:

Ой, да ты, калінушка-а,
Ой-да ты, малінушка-а...

Яму ўсё роўна—што ня пець, абы вясёла было... Бо цяпер зямля пачынае засынаць, толькі ціха калышуцца лісты—скора і яны змоўкнуць. Калі сьпіць зямля, тады добра разносяцца па шаўковай паверхні соннай зямлі галасы. З самага маленькага родзяцца ўдвое большымі...

Вёска яшчэ ня сьпіць: гуляюць пасьля нядзелі хлопцы з дзяўчатамі. Ад сабачага брэху пагалоска глуха. Дзявочай песьні ня можна разабраць.

— Ой, Ду-у-на-ай, Ду-у-на-ай...

Вясёлыя начлежнікі з маладзейшых рагочуць. Трое ляглі, параскідалі ногі адзін на другога і сьпяваюць прыпэўку:

Вот вам, дзевачкі, навука:
Не хадзіце ў сад гуляць:
Не завіце чорна жука...

Гг-э-эй!

— А-а пчхэ!

— Цішэй вы, падшывальцы!—крычыць на іх дзед Сапрон. І крычыць ня тое, каб з сэрцам, а яму хочацца гаварыць, папець.

З-за лесу глядзіць круглы месяц: ён зялёны, а сьвет яго на кустах жоўты. Зоркі пераліваюцца, а якая і зьнянацку рассыплецца над лесам.

— У такія ночы глядзіць дзед на месяц і гавора: помню, як з пад пана адышлі, работалі мы... Дня тады не хапала...

Словы гэтыя нязначны. Гэта ўзварушыліся ўспаміны ў старога. На начлезе ён шмат чаго перадумае, перажыве: аб новым сьвеце і людзях. Паганьбіць, штонебудзь пахваліць—і яшчэ раз перадумае... Лёг на мяккую купіну, прыслухоўваецца да гутаркі Андрэя з Кірылай Чарняком—пажылым чалавекам. Дзед Сапрон ведае, што Кірыла Чарняк ладзіцца жыць «панавому», што адрокся ён і ад царквы і ад бога. Хоць і сам дзед толькі адзін раз хадзіў у царкву, а ўсё за недахопам часу. Кірыла Чарняк чытае газэты і мудрыя для ўразуменьня дзеда кніжкі. Андрэй-комсамолец, хлопец востры. Сапрон ня ганьбіць, можа ня звыкся толькі з гэтым...

— Вясною хутар на шасьціполку разьбіў—гаворыць стала Кірыла Чарняк і пускае з папяроскі дым.

— Малатарню-б завесьці нам. Ва ўсёй вёсцы няма. Каб прыклад паказаць другім. А то ў іншых ёсьць і сродкі, а не адарвуцца вось ад старога.

Андрэй гаворыць разважна. Хоць і малады, але яму прыходзіцца таксама гаварыць і на сходах.

Тады адклікаецца Сапрон.

— Малатарні гэтыя нам не па кішэні... Змалаціць можна цэпам і на таку, абы хлеб урадзіўся...

— Зусім ня тое, дзед!

Сапрон і сам ведае, што каб гэта малатарню ў яго гумно, дык ураз бы зьмяло асецьжыта, ды і стук малатарні бойкі...



Ўсё замоўкла... Ноч заснула глыбокім сном, авеяная пахам красак і сырасьці моху з лесу. Нібы заснуў і Сапрон. Сьпіць чутка і думае. Кірыла Чарняк з Андрэям шэптам гавораць пра самае блізкае: як-бы завесьці машыны...

* * *

Толькі ў аднаго чалавека былі другія думы. Сьцяпан Макеяў ляжаў здалёку ад вогнішча; у гаворку ня лез, а прыехаўшы, заваліўся пад куст. Думаў, што хлопцу дваццаць год, а ён такі непатрэбны. Людзі жывуць, родзяцца, а бацька яго нават за чалавека ня лічыць. На яго ўзваліў усю працу па гаспадарцы, сам ходзіць у мазаных ботах. Сягоньня моцна палаяў, што рана прыехаў з поля.

Не адзін раз хацелася кінуць бацькаў двор. Пайці, куды хочаш, хоць-бы парабком... А вясёласьць і жыцьцё начлежнікаў устрывожыла. Устаў і пашоў паглядзець коні. За кустом чуў, як аб ім пачалася гаворка.

— Марнее ні за вошта хлопец—пашкадаваў дзед Сапрон.

— Сам ён вінават!—сказаў Андрэй—паддаецца бацьку, а той усё верне на свой капыл.

— Казаў, жаніць зьбіраецца, каб значыцца хутар свой пашырыць, зямлі больш прыдбаць...

— А ён, мусіць, і ня ведае, што бацька жаніць зьбіраецца?!

— Ну, я-б ня вытрымаў—адказаў Андрэй—хіба малады сам сабе хлеба ня знойдзе? Пашоў-бы з двара, зьбег-бы...

Сьцяпан слухаў і адчуваў, што Андрэй гаворыць такую праўду, якая ня можа зьмясьціцца ў яго галаве, толькі часамі такая думка вынікае. Хадзіў ля коні, а ноч улівала ў грудзі ўрашучасьць зрабіць бацьку нешта злое, каб потым раздумаўся. Як вярнуўся да вогнішча, думка гэта афармілася.

— Пайду за пяць вёрст у Сенькава саўхозскі сад вартаваць,—там, казаў зямляк, чалавек патрэбен, а к бацьку не вярнуся, няхай тады за вухам пачэша...

Крыўда вырасла ў шырокую. Сьцяпану захацелася перад гэтымі, спачуваючымі яму людзьмі, расказаць.

— Нядаўна—пачаў ён—касілі мы з ім гарох. Прышоў, значыць, ён, пакурыў, паляжаў і кажа: «пайду там ля двара сушыць сена, а ты тут пакашывай!» Касіў я да вечара, а ў вечары прыхаджу: сена ня сушана, пашоў п'янстваваць на талаку. На другі дзень я намякнуў, што сена ня сушана.

— Чаму-ж ты ня высушыў?—кажа ён грозна.

— А ты-ж сам казаў...

— Слова за слова, аблаяў мяне на чым сьвет стаіць, хваціў грабельня ды за грудзі мяне—пабіліся... Гэта-ж, браткі, ня жыцьцё!...

І ўсе зразумелі, што калі так, дык дрэннае жыцьцё. З маленькага факту Сьцяпан хацеў разьвіць большае.

— Сілы ў бацькі хопіць на траіх, а гультайнічае...

—Яно так... спачуў Сапрон.—Бацька твой не такі, як другія: гуляць любіць, а сыну скуру дзярэ...

Вецер у самым версе, над лесам зашумеў, прарэзьліва закрычала сава. Дзед Сапрон успомніў:

— Тут-жа, у гэтым лесе, ноччу адзін лясьнік застрэліў чалавека,—і змоўк.

Сьцяпан чуў, як усе заснулі. Вогнішча тлела, вугальле раскідалася. Падышоў да Андрэя і лёг. Ён адчуў, што Андрэй больш за ўсіх зразумее яго, спачуе яму. Тармошачы за сярмягу, пачаў шэптам гаварыць:

— Андрэй, папрашу я цябе, не кажы ты нікому: уцяку я ад бацькі.

— Куды?—і Андрэй ні сколькі ня зьдзівіўся.

— Ёсьць адно месца... Ранком пайду... Коні тут застануцца.

Сьцяпан ляжаў на жываце. На твары была жаласьць, постаць была нязграбнай. Андрэй падумаў: «ці можна так зрабіць?»... Прышоў да думцы, што і сам-бы зрабіў так.

Сьцяпан увесь час ня спаў. Зоры пачалі тухнуць, чорнае дыханьне ночы зьмянілася шэрым. Па мокрай траве пашоў Сьцяпан, каб ня бачылі начлежнікі. Ногі абрасіліся да калена, было цяжка; старая шэрая сьвітка давіла на плечы. З лесу ён вышаў на шлях і пашоў па напрамку да месца, дзе ён будзе вартаваць сад.

Сонца паднялося высока і на полі пачалася праца. Начлежнікі ехалі, думаючы дзе мог падзецца Сьцяпан. Андрэй маўчаў. Думаў толькі: як адна ноч можа ўскалыхнуць пачуцьці чалавека; а такіх, як Сьцяпан з бацькам, шмат ёсьць...

Каля сваіх варот стаяў бацька Сьцяпана—Макей— абрузлы і моцны чалавек:

— Што-ж майго няма? — зьдзівіўся ён.

Сапрон паглядзеў назад, нічога не разумеючы:

— Можа коні не знашоў, ці заспаў.

Андрэй нікому не сказаў, толькі ўпамянуў, што коні ходзяць каля вогнішча.

Макей сярдзіта стукнуў каліткаю.

— Заспаў там, сукін сын... Казаўжа прыводзіць рана, няхай-бы касіць ішоў.

Тупаючы ў сенцах нагамі, моцны і жорсткі чалавек лаяўся і крычаў на сына.

— Эх ,сукін сын!..

Васіль Каваль.

Дýмы.

Пятрусь Броўка.

Навокал сінь...
навокал гладзь...
Сасонкі ў шэрані
стаяць,
Хістаюць плаўна
галавой
Нівы сьмяюцца
нада мной.

На што, На што,
чаго сумую?
Ў зялёну ноч
і ясны дзень.

Спаткаю зноў
я залатую
Вясну ў радасьці
людзей!

Пайду ў палі,
дзе лес варожыць
дзе хвалі мора
— каласоў
І свой напеў
я кіну ў пожні
пад шэпт ільняных
валасоў.

Новыя „Купалы“ і „Коласы“.

Ужо колькі разоў пісалі аб тым, што сярод некаторых пластоў нашага маладняка распаўсюджылася эпідэмія новай заразьлівай хваробы, якая выяўляе тэндэнцыю да далейшага пашырэньня. Ня пужайцеся, гутарка будзе ісьці не аб грыпе, пра які за апошні час пачалі пісаць у газэтах, а аб... вершаманіі.

Скажэце, таварышы, хто з нас за ўсё сваё жыцьцё хоць раз не спрабаваў сваіх вершатворных здольнасьцяй? У гэтым няма нічога дзіўнага, бо цяпер разьвілося столькі поэтаў здольных і няздольных, што амаль кожны хлапец, кожная дзяўчына пачынаюць разважаць: а чаму-бы мне не зрабіцца поэтам? Гэта-ж так модна.

І сярод гэтых з дазваленьня сказаць «поэтаў» трапляюцца такія самаўпэўненыя хлапцы, якія свае няўдалыя спробы ў вершаваньні лічаць ня ніжэй за творы Купала і Коласа. Аб такіх «Купалах» і «Коласах», мы хочам падзяліцца сваімі думкамі, падмацаваўшы апошнія вытрымкамі з іхніх твораў.

Перада мною ляжыць цэлая кіпа вершаў. Дазвольце прачытаць некаторыя з іх. (Мы не бралі найбольш тэндэнцыйныя вершы, а ўзялі першыя, трапіўшыя пад руку).

Вось пару радкоў аднаго бязыменнага поэты, прыслаўшага верш «Супроць паноў» бяз подпісу.

«На успамін—пану гатуем
Едкі газ яму рыхтуем,
Каб падушыць іх як клапоў
І узмацніць бальшавікоў».

Што і казаць, высокі стыль, глыбокая рэволюцыйная думка. Таварыш рыхтуючы супроць паноў «едкі газ», каб падушыць іх, як клапоў, як відаць, досыць напрактыкаваўся ў зьнішчэньні клапоў на сваім ложку. Гэта сапраўды легкая справа. Купіў сабе ў аптэцы за 5 кап. нейкага «смуроду», паднес да сьцяны, пасыпаў, і годзе...

Вось пара вершыкаў пра каханьне, якое зьяўляецца галоўным мотывам «творчасьці пачынаючых». Калі не спадабаюцца, дык ўжо ня ведаю, чым вам угадзіць.

«На што ў мяне сваім паглядам
Пакой і радасьць ты ўзяла
І атравіла сэрца ядам
Свае-жа ты мне не дала
На што мяне ты моцна мучыш
Скажы ты мне хоць раз «люблю»
А я з табой, і ты палучыш
Маю бяспечную судзьбу.
Скажы, чаму ты празіраеш
Мае душэўныя агні,
Скажы, чаму ты ня чытаеш
Сьцішкі нябрэжныя маі»?

Таварышы чытачы, ня ведаю як вы але я проста ў захапленьні ад такога «лірычнага і музыкальнага вершу». І дарэмна скарэмнічае аўтар называючы свой верш «нябрэжным сьцішком»...

Ідзем далей. Вось твор другога пачынаючага, да якога ня трэба ніякіх комэнтарыяў:

«Калі настане час убачыць
Каго так шчыра я кахаў,
Таго, хто заставіяў мяне ў чорны
вочы цалаваць,
Каб я яе ўбачыў, моцна-б я яе
пацалаваў,
Дзяўчыну тую чарнавоку,
Якую моцна так кахаў,
Якую прытуляў да свайго боку
І ад шчырага сэрца ёй казаў»...

Далей ідуць гарачыя пажаданьні нашага лірыка сваёй «каханачцы». Адпушчаем іх, і прыводзім канец вершу, яго апошнія два радкі:

«... Вянец, вянец, вянец,
І вершу канец»!

Так заканчывае свой «глыбока лірычны» і «высока мастацкі» верш аўтар. Як жа пасьля гэтага не паверыць, што сапраўды—«каханьне вялікая сіла».

Пакінем гэтых аўтараў з іх каханьнем, хай сабе кахаюцца, і пяройдзем да іншых катэгорый поэтаў, поэтаў **плагіятараў**.

Вось што піша адзін з такіх, у сваім лісьце да рэдакцыі:

«Дарагія таварышы! Дасылаю вам пры гэтым некалькі **ўласных вершаў**. Калі падойдуць «таўкнеце».

Мы наўмысьля падкрэсьлілі словы «ўласных вершаў», бо гэты таварыш прыслаў у рэдакцыю крыху «падпрацаваныя» вершы Есеніна і Жарава, выдаўшы іх за сваё («Гармонь, Шаганэ, ты моя Шаганэ»).

—

У нумары 10 «Чырвонай Зьмены», за гэты год быў зьмешчан артыкул Іл. Б. аб творчасьці пачынаючых поэтаў. У гэтым артыкуле аўтар даводзіў наліччa вялікага ліку кепска напісаных вершаў і рабіў вывад, што некаторым пачынаючым, якія няздольны да складаньня вершаў, варта было-б кінуць іх пісаць.

На гэты артыкул мы атрымалі ліст з абурэньнем таварыша **С. Вашкевіча**, які абвінавачвае Іл. Б. у «нападзе на пачынаючых» і г. д. «Шкада браток, што ты ня ўмееш цаніць чырвоных кветак, якія вырасьлі ў Кастрычнік, ты павінен імі любавацца, а не таптаць у гразь сваймі няўклюжымі мядзьвежымі нагамі». (З допісу Вашкевіча).

«Чырвоныя кветкі», вершы якіх мы вышэй цытавалі, даюць вельмі кепскі пах і псуюць паветра, таварыш Вашкевіч. Хочаце любавацца імі—калі ласка на здароўе, ніхто не перашкаджае...

Я. Зэльцар.



ЗАЎТРА ДРУГІ МАСАВЫ СПЭКТАКЛЬ!

У сераду 23-га лютага ў Дзяржтэатры адбудзецца другі агульнадаступны спэктакль для моладзі, організаваны „Чырвонай Зьменай“ і клюбам „КІМ“

Будзе пастаўлена „СТРАЛОК ТЭЛЬ“

Продаж білетаў (ад 15 да 75 коп.) штодня ў рэдакцыі «Чырвоная Зьмена» і клюбе «КІМ». Рэшта білетаў--у дзень спэктаклю ў касе тэатру з 5 гадзін.

САЮЗНЫЕ НАВІНЫ.

(У ЦК УсеЛКСМ).

Мэдагляд у гэтым годзе.

Па прыкладу мінулых гадоў Наркам аховы здароўя ў гэтым годзе праводзіць **мэдагляд рабочых падросткаў**. Мэдагляд падросткаў у мінулым годзе даў наступныя вынікі: з 81.465 чал. атрымалі курортна-санітарнае лячэньне 1.634 чал., паслана ў дамы адпачынку—13.607 чал., карысталіся амбуляторным лячэньнем—4.464 чал., а астатнія атрымалі дапаўніцельныя водпускі, зьмянілі профэсыю і г. д.

Мэдагляд у гэтым годзе павінен ахапіць найбольшую колькасьць падросткаў, занятых ня толькі ў дзяржаўнай і буйнай прамысловасьці, але і рабочых падросткаў дробна-саматужнай вытворчасьці, сельска-гаспадарчай рабочай моладзі і рабочых падросткаў нявытворчых саюзаў. Улічваючы, што ў мінулым годзе мясцовымі аддзеламі аховы здароўя была вылучана нязначная колькасьць месц у санаторыях для падросткаў, Наркам аховы здароўя і ЦК УсеЛКСМ у гэтым годзе брануюць гэтыя месцы ў цэнтры.

Усеагульнае навучаньне і комсамол.

Урадам СССР прыняты закон аб увядзеньні **ўсеагульнага пачатковага навучаньня ва ўсёй краіне не пазьней, чым у** 1934 годзе. У сучасны момант пачатковая школа ахоплівае толькі 47 процантаў дзіцячага насельніцтва школьнага ўзросту. У сувязі з гэтым перад усімі грамадзкімі організацыямі краіны паўстае задача к 1934 году г. зн. к моманту ўвядзеньня ўсеагульнага пачатковага навучаньня—пашырыць сетку зараз існуючых школ, пабудаваць новыя і пачаць ужо цяпер збор сродкаў на гэтыя мэты.

ЦК УсеЛКСМ прыняў па гэтаму поваду спэцыяльную пастанову. Комсамол павінен шырока растлумачыць насельніцтву сэнс і значэньне ўвядзеньня ўсеагульнага пачатковага навучаньня. Комсамольскія ячэйкі ў вёсцы ў сувязі з гэтым павінны стаць першымі зачыншчыкамі па збору сродкаў на пабудову новых школ і рамонт старых. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на організацыю спэцыяльных школ з 1-2 гадовым навучаньнем для пераросткаў (ад 14 да 15 год), якія ня маюць магчымасьці паступіць у нормальную пачатковую школу.

Акрамя ўсяго гэтага ў сваёй пастанове ЦК зьвяртае ўвагу ўсяго Саюзу на такое ненормальнае зьявішча, як няпоўнае ўкомплектаваньне пэдагогічных ВНУ тэхнікумаў, што пагражае недахопам настаўнікаў пры правядзеньні ўсеагульнага навучаньня. Мясцовыя організацыі УсеЛКСМ павінны ў гэтым годзе організаваць кампанію за пасылку комсамольцаў у пэдагогічныя вучэбныя ўстановы.

Удзел Комсамолу ў мэліорацыі

На тэрыторыі Саюзу рэспублік маецца вялізарная колькасьць нягоднай для выкарыстоўваньня зямлі (балот, забалочаных сенажацяй, затапляемых зямель, бязводных зямель, і г.д). У шэрагу раёну гэта прыводзіць к вялізарнаму перанасяленьню сялян з аднаго раёну ў другі і не дае магчымасьці поўнасьцю выкарыстаць рабочую сілу ў вёсцы. Такім чынам, барацьба з беспрацоўем і з аграрным перасяленьнем упіраецца ў пытаньне аб правядзеньні мэліорацыі ў вёсцы. Мэліорацыя ўключае ў сабе акрамя асушкі балот і цэлы шэраг іншых мерапрыемстваў.

Задача Комсамолу — растлумачваць насельніцтву важнасьць і задачы мэліорацыі, прымаць актыўны удзел у організацыі таварыстваў па сумеснай асушцы балот, сенажацяй, па організацыі здабычы торпу і інш. Асаблівую ўвагу пры гэтым трэба зьвяртаць на ўцягненьне беднаты і батракоў у гэтыя таварыствы. Ячэйкі Комсамолу павінны наладзіць таксама і справачную работу па ўсім гэтым пытаньням.

Мясцовыя організацыі павінны таксама прыняць ўсе захады да пасылкі магчыма большай колькасьці комсамольцаў на розныя курсы па мэліорацыі.

Да 18 сакавіка

Вядзецца падрыхтоўка да дню МОПР'у—Парыскай Камуны (18 сакавіка). Гэты дзень пройдзе пад лёзунгамі ўзмацненьня працы Мопраўскіх ячэек, ліквідацыі запазычнасьці па сяброўскім узносам, кампаніі протэсту супроць белага тэрору і ў прыватнасьці супроць паддзеей у Заходняй Беларусі.

У тры радкі

— На 1 мая 1927 году прызначан **розыгрыш ўсесаюзнай авіацыйнай лётарэі.**

— **10.300 рублёў сабрана дагэтуль па БССР на карысьць палітвязьняў і галадаючых працоўных у Заходняй Беларусі.**

— 26 сакавіка гэтага году склікаецца 4-я МЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ МОПР'у.

— **Усебеларускую конфэрэнцыю школ рабочай моладзі і павышанага тыпу** склікае Галоўпалітасьветы ў маі месяцы.

— **Акруговыя камісіі па правядзеньню 10-й гадавіны Кастрычнікавай Рэволюцыі ў БССР** організуюцца па ўсёй БССР ў сакавіку г. г.

Не „ад варот“, а праз юнсэкцыю!

У канцы мінулага году ў «Звезде» была зьмешчана корэспондэнцыя аб тым, што адміністрацыя Лесбелу прыняла на працу па протэкцыі і бяз ведама біржы працы 2-х падросткаў.

У адказ на гэту корэспондэнцыю праўленьне Лесбелу паведаміла: «Няма нічога дрэннага ў тым, што прынятыя падросткі працуюць на адным прадпрыемстве з бацькамі, бо яны не пад'уладны адзін другому і працуюць па розных галінах»(?)

Але «вумная» адпіска адміністрацыі, як і трэба было чакаць, ня была прынята пад увагу. Асыстэнт інспэктара працы зрабіў досьлед, пры чым выявіў наступнае: у свой час праўленьне Лесбелу прыняла на працу дваіх падросткаў, сваякоў сваіх-жа служачых і па протэкцыі апошніх. Гэтыя падросткі працавалі амаль цэлы год, пры чым адзін з іх атрымліваў пэнсыю па 9-му разраду. Прадстаўніком-жа юнсэкцыі Біржы Працы адміністрацыя адказала, што «бронь запоўнена».

У сучасны момант пад уплывам аддзелу працы і прокурора гэтыя падросткі з працы зволены, а замест іх прыняты беспрацоўныя, прысланыя юнсэкцыяй. Справа-ж аб прыняцьці на працу па протэкцыі будзе накіравана прокурору.

Гэта справа яшчэ раз паслужыць папярэджаньнем усім гаспадарцам аб немагчымасьці прыёму на працу моладзі «ад варот».

Запытаньні і адказы.

Запытаньне № 809. (Вучняў) На якія факультэты падзяляецца Смаленскі універсытэт?

Адказ. Смаленскі ўніверсытэт падзяляецца на мэдыцынскі і пэдагогічны факультэты. На пэдагогічным факультэце есьць аддзяленьні: літаратурна-лінгвістычнае, фізыка-матэматычнае і прыродазнаўчае.

Запытаньне № 810. (Краўчэнка). Ці есьць у БССР агульна-адукацыйныя курсы і якая патрэбна адукацыя для паступленьня на іх?

Адказ. Агульна-адукацыйныя курсы маюцца амаль што ў кожным акруговым горадзе БССР. Для паступленьня патрабуюцца веды 7-мігодкі.

Запытаньне № 811. (П. Г.). Ці можа беспартыйны хлапец прысутнічаць на сходзе ячэйкі, калі разьбіраюцца пытаньні аб дысцыпліне і калі той хлапец хоча ўступіць у ячэйку?

Адказ. Можа прысутнічаць.

Запытаньне № 812. (Лікбеза). Па якім падручнікам трэба вучыцца у Лікбезе і ці добра робіць раённае АПА, што дае для заняткаў падручнікі «Прэч няпісьменнасьць» 1920 году.

Адказ. Для лікпунктаў Галоўпалітасьветай распрацованы вызначныя падручнікі і абавязкова трэба паведаміць АКРАНА, калі РайАНА снабжае лікпункт ня тым, што трэба.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ.

З. Ангарэціс. Фашысцкі пераварот і расстрэл комунараў у Літве. Дзярж. Выдавецтва. 1927. 64 стр. Ц. 20. к.

17-га лютага споўнілася два месяцы са дню фашысцкага перавароту ў суседняй з намі Літве. З самага пачатку ў дзейнасьці літоўскіх фашыстых, а затым і ў перавароце адчувалася рука самага злоснага ворага СССР—капіталістычнай Ангельшчыны. Няма сумненьня ў тым, што СССР гэты пераварот накіраваны супроць і ўжо па аднаму гэтаму ні адзін комсамолец ня можа застацца к яму раўнадушным. Патрэбна ведаць спружыны, якія рухаюць унутраную і надворную палітыку літоўскай дзяржавы, трэба ведаць становішча яе і яе магчымасьці. У гэтым дапаможа першая частка кніжкі тав. **Ангарэціса**—выдатнага літоўскага комуніста, добра ведаючага становішча спраў.

Вядома, што калі фашыстыя прышлі да ўлады, яны безадкладна пачалі расправу з рабочай клясай Літвы і яе авангардам—Комуністычнай партыяй і Комсамолам. Праз тыдзень пасьля перавароту ваенна-палявы суд паслаў на расстрэл лепшых літоўскіх комуністых—т. т. **Пажэлу, Грэйфэнбэргэра, Гэдрыса і Чорнага.** З таго часу машына „правасудзьдзя“ не перастае работаць і сьмяротныя кары і катаржныя прыгаворы прыносіць кожнае пасяджэньне суда катаў Сірона. Іх ахвяр многа комсамольцаў. Комсамольцамі былі і т. т. **Рафаіл Чорны і Іосіф Грэйфэнбэргэр,** відомы пад клічкаю Віктара многім комсамольцам Савецкай Беларусі, дзе ён быў адзін з першых організатараў саюзу. Іх слаўнай памяці прысьвечаны апошнія старонкі кніжкі, якую мы зараз рэкомэндуем чытачу.

Шпацыя.

Менскі ЦРК заварушыўся.

Ён на справе зьніжае розьнічныя цэны.

«Сапраўдная барацьба з бюрократызмам і прывядзеньне ў парадак прамысловай гаспад... цясьнейшым чынам увязаны з проблемай зьніжэньня цэн, таму што як раз высокія ... зьяўляюцца крыніцаю надзвычайнага абрастаньня і бюрократычных скажэньняў вытвор... і ў асаблівасьці гандлёвых апаратаў».

(З пастаноў лютаўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Па 600 рублікаў на камандыроўку...

(Па матар'ялам РСІ)

У сваім фальетоне ў «Правде» ад 18-га лютага тав. Сасноўскі гаварыў аб консэрватыўнасьці Наркамгандлю РСФСР, які ніяк ня можа згадзіцца з скарачэньнем шляху прахаджэньня абутку ад фабрыкі да спажыўца хоць-бы на адзін сындыкат. Доўгі ланцуг сындыкатаў і розных гандлевых установаў туга падаецца скарачэньню!

Ня менш туга падаюцца скарачэньню нават і маленькія ланцужкі кожнай такой установы ў паасобку.

Напрыклад, аб'ядваньне вытворчага і гандлёвага аддзелаў МЦРК ў адзін-опэрацыйны-ледзь зьнішчыла паралялізм у працы, але ня дала колькаснага памяншэньня ў штатах! Усе працаўнікі засталіся працаваць як і раней на сваіх мясцох, толькі зьлілі дзьве назвы двух аддзелаў у адну назву. К канцу 1926 г. мы маем ужо там павялічэньне выдаткаў на 0,5 проц.

Былі выпадкі, калі тэй ці іншы супрацоўнік МЦРК ня ведаў, якую ён займае пасаду. Гэта бязумоўна, пацьвярджае, што тут існавалі раздутыя штаты.

Часьценка супрацоўнікі МЦРК свае салідныя пэнсіі «акругнялі» даволі салідны мі камандыровачнымі сумамі. Напрыклад, камандыроўкі закупшчыкаў мануфактуры і галянцярэі працягваліся 30-40 дзён і абходзіліся праўленьню ў 600 руб. у месяц, у той момант, калі можна была гэтыя тарговыя опэрацыі зрабіць у куды меншы срок.

Усё вышэй паказанае прывяло к таму, што зьніжэньне цэн праводзілася не за лік зьмяншэньня сваіх выдаткаў, а выключна за лік зьмяншэньня свайго прыбытку.

* * *

За апошні час становішча тут некалькі зьмянілася. Зьніжэньне цэн у гэтым месяцы па МЦРК ішло выключна за лік зьмяншэньня выдаткаў.

У лютым месяцы скарацілі цэны на муку, масла, скуру, селядцы, крупу, абутак і інш., і ўсё гэта за лік павялічэньня нагрузкі служачых і пашырэньня таваразвароту. Пераглядаюцца астатнія асортыманты тавараў з мэтай зьніжэньня цэн на іх.

Скорочаны ўпраўленчы апарат да 20 чалавек. Скарочан артыкул выдаткаў на разьезды і камандыроўкі.

Пачатак добры. Трэба пажадаць МЦРК ісьці ў далейшым такім-жа шляхам і такім чынам прыблізіць цэны на тавары да шырокага спажыўца.

Р. Г-п.

НАРКАМГАНДЛЬ—НАШ САЮЗЬН... „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЕ“

Наркамгандаль вітае пачатак на старонках „Чырвонай Зьмены“ ка... барацьбы за сапраўднае зьніжэньне розьнічных цэн і абяцае аказаць п... падтрыманьне газэце ў гэтай справе.

У сваю чаргу Наркамгандаль спадзяецца знайсьці з боку шырокі... рабочай і сялянскай моладзі дзелавую дапамогу ў гэтай рабоце на мясцох.

Рабоча-сялянская моладзь павінна таксама пісаць у сваю газэту аб... заўважаных недахопах у правядзеньні кампаніі па зьніжэньню розьнічных...

Упаўнаважаны рэспубліканскай камісіі
па зьніжэньню цэн А. НАЙДУС.

ТАННЕЙ!

Зьніжэньне цэн у МЦРК

Кампанія па зьніжэньню цэн на болей ходкія рэчы вядзецца Менскім Цэрабкопам ужо даўно.

Але рэальныя дасягненьні ў гэтым напрамку выявіліся толькі цяпер.

Досыць прывесьці даныя па ўрэзцы цэн на рэчы першае патрэбы за апошні 7-10 дзён.

НАЗВА ТАВАРАЎ	ЦЭНЫ раней	ЦЭНЫ цяпер
Ніткі	13 кап.	11 к.
Тканіна	6 р. 15 к. мэтр	5 р. 56 к.
Бацінкі-скараходы	14 р. 55 к. пара	14 р. 15 к.

Прыведзеныя весткі,—амаль у... тычацца «унівэрсальнага магазыну»...

Між іншым МЦРК вельмі здаво... тым, што ў яе цыпулька пітак ка... танней на 2 кап., чым у «Дзярж... машыне». Апошней трэба падцягн...

Шпарка ідзе зьніжэньне цэн.

Дасягненьні ёсьць у буйным бакалей... магазыне ЦРК № 16 (Ленінская вул)...

Вось лічбы:

Назва тавараў	Цэны за кіл... раней	цяп...
Цукер	78 к.	73
Макарон	54 к.	50
Крупы (грэцкія	21 к.	19½
« (пярловыя)	27 к.	24
Аўсянка	32 к.	27
Сода для піцьця	28 к.	22 к.
« « бялізны	14 к.	9½
Мука бульбавая	27 к.	25 к
Селядцы астраханскія	54 к.	48 к.
Масла (алей)	58 к.	55 к.
Мука пшанічн. 1-га гат.	21 к.	20 к.
« « 2-га гат.	27 к.	25 к.
Лімоны	30 к.	17 к.

МЦРК не павінен застацца на гэ... дасягненьнях, а ісьці далей па шляху... праўднага зьніжэньня розьнічных цэн.

Адказныя рэдактары **А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 23994 2 Дзярждрукарня БДВ.